УДК 82-193.3

**Т. М. Федарцова**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# КАНЦЭПТАСФЕРА НЕБА Ў ТВОРАХ М. БАГДАНОВІЧА, М. ТАНКА, Р. БАРАДУЛІНА

Неба – адна з фундаментальных існасцяў матэрыяльнага свету, якая займае цэнтральную частку ў свядомасці чалавека, становіцца неад'емным кампанентам духоўнай культуры нацыі. Ва ўсе часы чалавек з надзеяй і хваляваннем узіраўся ў нябесную высь, шукаючы ў нябёсаў абароны, аховы, спагады, парады і дапамогі ў вырашэнні складаных жыццёвых задач. Таму не дзіўна, што канцэпт неба заўсёды прысутнічаў у творчасці мастакоў прыгожага пісьменства, пачынаючы ад антычнасці да нашых дзён. З пашырэннем інфармацыйнага поля канцэптасфера неба значна ўзмацняе сілавое поле духоўнасці, павялічвае інтэлектуальны пласт, нараджае новую, нязнаную да гэтага часу вобразнасць, натхняе на выпрацоўку адмысловых творчых прыёмаў.

Дадзенае даследаванне прысвечана вызначэнню асаблівасцей канцэптуалізацыі неба і нябесных цел у паэтычных тэкстах. Бясспрэчна тое, што канцэптуалізацыя адносіцца да ліку ключавых паняццяў кагнітыўнай лінгвістыкі, навукі, якая актыўна развіваецца ў межах антрапацэнтрычнага падыходу сучаснага мовазнаўства і літаратуразнаўства. Працэс канцэптуалізацыі – адзін з базавых працэсаў кагнітыўнай дзейнасці чалавека. Ён заключаецца ў асэнсаванні чалавекам усё новай і новай інфармацыі, вынікам чаго становіцца фарміраванне ўяўленняў пра сапраўднасць быцця ў выглядзе ментальных адзінак – канцэптаў (у нашым выпадку – неба, зоркі, месяц, сонца). Вывучэнне канцэптаў у мастацкім творы дапамагае зразумець светапогляд не толькі самога аўтара, але і цэлай эпохі, і нават ментальнасць цэлага народа.

**Ключавыя словы:** кагнітыўны падыход, канцэпт, канцэптасфера, нябесныя аб'екты, метафара, парадыгма, лексема.

**T. M. Fedartsova**
Belarusian State Technological University

# CONCEPTUAL SPHERE OF THE SKY IN THE WORKS OF M. BAGDANOVICH, M. TANK, R. BARADULIN

Sky – one of the fundamental essences of the material world, which occupies the central part of human consciousness, is becoming an integral component of the spiritual culture of nation. At all times, people with hope and excitement peered into the heavenly heights, seeking protection from the sky as well as sympathy, advice and assistance in dealing with difficult life challenges. It is therefore not surprising that the concept of heaven is always present in the works of masters of artistic expression, ranging from antiquity to the present day.With the expansion of information field sphere of concepts about sky significantly increases spiritual field, enlarges inntelligent layer, generates new imagery unknown until that time, inspirs the development of new methods for personal authorial creativity.

The research dwells upon the definition of conceptualizing features of the sky and celestial bodies in the poetic texts. There is no doubt that the conceptualization is one of the key concepts of cognitive linguistics, science, which is actively developing within the boundaries of anthropocentric approach to modern linguistics and literary studies. The process of conceptualization is one of the basic cognitive processes of human activity. It comprises the interpretation of all new information resulting in the formation of ideas about the reality of life in the form of mental units - concepts (in our case – the sky, the stars, the moon, and the sun). The study of concepts in fiction helps to understand the world of the author himself as well as the whole epoch, and even the mentality of an entire nation.

**Key words:** cognitive approfch, concept, conceptual sphere, celestial bodies, metaphor, paradigm, lexeme.

**Уводзіны.** На мяжы двух тысячагоддзяў у сучасным літаратуразнаўстве адбываецца заканамерная змена навуковых парадыгм: XIX ст. увайшло ў гісторыю як параўнальна-гістарычнае літаратуразнаўства, XX ст. нарадзіла сістэмна-структурны метад, а ў XXI ст. складваецца антрапацэнтрычная парадыгма.

Асноўная мэта даследавання заключаецца ў разглядзе асаблівасці канцэптасферы неба.

**Асноўная частка.** Максім Багдановіч, напрыклад, імкнуўся сваёй творчасцю выхоўваць нацыянальную самасвядомасць, каб праз яе больш актыўна і творча ўспрымаць агульначалавечыя ідэалы. Гэтай мэце служыць хрысціянская міфалогія,

шырока ўведзеная паэтам у разнастайныя творы. Паэт па-мастацку ўвасабляе біблейскія архетыпавыя вобразы і матывы, народныя паданні і прытчы. Таму самыя актыўныя апазіцыі яго творчасці – Жыццё і Смерць, а таксама канцэпты Зямля і Неба. Прычым канцэптасферы неба паэт удзяляе значную ўвагу. Асабліва гэта заўважна ў першай частцы знакамітага «Вянка», паэтычна названай аўтарам «Малюнкі і спевы». Зачараваны маўклівай таямніцай памежжа вечара і ночы аўтар назірае свяшчэннадзейства перадачы ўлады над зямлёй маўклівай, на першы погляд, касмічнай стыхіі, якая выводзіць на паэтычную арэну канцэпты *месяц*, *зоркі*, *сонца*, *аблокі і інш.*

У творчасці Максіма Багдановіча прыём увасаблення найчасцей здзяйсняецца шляхам актыўнага ўключэння ў прэдыкальную аснову сказа назоўніка, які называе нябесны аб'ект, і дзеяслова (найчасцей дзеяслова руху: *устаў*, *падае*, *плыве*, *аглядае*):

Сумна *плыве* маладзік бледна-сіні
Ў небе вячэрнім, зялёным, як лёд;
Іскрацца зорак сняжынкі маркотна [1, с. 65]

ці:

Месяц круглы *ўстаў* на небе [1, с. 85].

Пры стварэнні вобраза зорнага неба намі адзначаны таксама рух да спалучэння рэальнага і фантазійнага (зямнога і небнага):

Блішчыць у небе зор *пасеў*;
У полі – рунь і ў небе – рунь [1, с. 61].

Для стварэння вобраза зорнага неба аўтар выкарыстоўвае не толькі множны лік (*зоркі*), але даволі часта ўжывае і лексему сузор'е, або індывідуальна аўтарскія спалучэнні з лексемамі мноства: безліч, грамада, харавод, вянок, пацеркі. Дзякуючы такому аўтарскаму прыёму падкрэсліваецца вялікая колькасць зорак, іх важнасць у вячэрнім або начным небе:

Ззяе серабром іголак
Зор *грамада* [1, с. 60]

ці:

Патроху праз цмень выглядалі
Зорак дрыжачых *вянкі* [1, с. 64].

Лексема *зорка* ў шматлікіх вершах Максіма Багдановіча даволі часта ўжываецца ў складзе нечаканай метафары. Пісьменнік кожны раз знаходзіць для яе новыя вобразныя адпаведнікі: «Іскрацца *зорак сняжынкі* маркотна», «Блішчыць у небе *зор пасеў*», «у небе ціха *зоркі расцвілі»* і г. д. Ды і вечар, як дбайны хлебароб «*пылам зор* небасхіл *абсявае*». Самыя частотныя параўнанні зорак адзначаны з лексемамі, якія ўваходзяць у змест канцэпту «Чалавек». Гэта лексемы *вочы, грудзі*, *слёзы, думкі* і інш.

Упалі з грудзей Пана бога,
Парваўшыся, пацеркі зор [1, с. 106].

Іншым часам паэт робіць нябесныя аб'екты саўдзельнікамі падзей. Раманс «Зорка Венера» прысвечаны палымянаму каханню, якое не можа здзейсніцца з-за хуткай ростані, але закаханыя не застаюцца ў адзіноце, бо іх пагляды сустрэнуцца і зліюцца на далёкай планеце, таму сабе ў дапамогу яны і бяруць апякунку кахання – зорку Венеру, дзе ў глыбокай цішы ночы і адбудзецца сумоўе іх сэрцаў. Тонкае адчуванне незваротнасці для паэта радасці кахання на зямлі вымушае творцу падняць палымянасць пачуцця да касмічных высяў, ён быццам хоча схаваць яго не толькі ад прагнага чужога вока, але і ад наканавання няўмольнага лёсу.

З дапамогай канцэпту *месяц* паэт часта стварае пераважна эмацыянальна афарбаваныя малюнкі, імкнучыся перадаць адпаведную настраёвасць і пачуццёвую дынаміку.

Так, цікавы і незвычайны вобраз месяца падаецца ім у акварэльным трыялеце «Вечар», бо асноўнае месца ў дадзеным творы займаюць выразныя зрокавыя, пластычныя замалёўкі, апісальныя рэаліі:

На небе месяц ўстаў зялёны
І хутка стане снегавым.
Над лесам, дзе шапочуць клёны,
У небе месяц ўстаў зялёны...
Усё спіць. Не бачыць свет стамлёны,
Што, свецячы праз хмарак дым,
У небе месяц ўстаў зялёны
І хутка стане снегавым [1, с. 222].

Трыялет, дарэчы, датаваны 1910 г., і таму яго можна лічыць першай спробай Багдановіча ў жанравай разнавіднасці трыялета. На жаль, на гэты ўзор верша ўвага даследчыкаў не звярталася, мабыць, з-за «раскутасці» дадзенай цвёрдай вершаванай формы шляхам замены прасторавага прыназоўніка «на», ужытага пры пастаноўцы тэмы, на больш канкрэтызаваны (суб'ектыўны) прыназоўнік «у» пры яе развіцці і завяршэнні. Але з дапамогай гэтага прыёму паэт не толькі значна звужае прасторавую «разгорнутасць» нябёсаў, але і ўдакладняе месца дзеяння і дамагаецца пэўнага руху вобраза надыходзячых пераменаў у прыродзе.

Таму, як нам думаецца, менавіта варыянтнасць прыназоўнікаў паказвае рух думкі паэта і «вертыкальна» – ад матухны-зямлі да неба, і «гарызантальна» – у зямной і надземнай прасторы. Паэт шкадуе, што «стамлёны свет» так неабачліва можа праспаць найцікавейшую падзею – змену прыродных фармацый, якая адбываецца не сцішана-спакойна, а вірліва, жорстка, бо нават месяц рэзка змяніў сваю фарбу са звыклай, супакоена-радаснай, жоўтай на больш жорсткую, можа, нават агрэсіўную, зялёную. Але і гэта толькі прамежкавы колер будучай падзеі, і ў развіцці тэмы верша ён замяняецца нечаканым эпітэтам «снегавы». Гэтым прыёмам аўтар паказвае як змена прыроднай фармацыі (памежжа восені

і зімы) асацыятыўна як бы падвоена вобразам памежжа вечара і ночы. На такім памежжы і адбываецца свяшчэннадзейнасць вялікіх зменаў у прыродзе. Але памежжа само па сабе катэгорыя няўстойлівая, таму яго пэўнай характарыстыкі ў вершы няма, час, у які адбываюцца падзеі, толькі мяркуецца. Тым не менш падтэкставасць трыялета дае магчымасць уявіць, як яно (памежжа) дадаткова ўносіць у асацыятыўнае ўспрыняцце прыроды, жыцця сваю адмысловую каляровую гаму. Дзякуючы яе імпульсіўнай замене, мы можам назіраць, як сімвалічна-прадметны знак ночы – месяц – уплывае на разгорнутасць падзей. Безумоўна, гэты трыялет медытатыўны, бо логіку думкі творцы можна ўявіць як панарамны паказ бясконца зменлівага жыцця.

Разгледзім як адбіліся агульнакультурныя ўяўленні аб прасторы неба ў свядомасці Рыгора Барадуліна. Паэт даволі часта выносіць дадзеныя канцэпты ў загалоўкі вершаў («Ішла над ціхім лесам поўня», «Рэгістрацыя шлюбу з небам», «Адхінуць небакрай», «Босая зорка», «У блізкім небе спавядаўся дым», «Сонцу кланяецца каравай», «Сонцакропка» і інш. У тэкстах актыўна прысутнічаюць лексічныя адзінкі, якія прама называюць неба, нябесныя аб’екты, або з’явы, звязаныя з небам. Але ў яго творчасці ўжо няма той Багдановічаўскай чароўнай замілаванасці зоркамі, вобраз месяца саступае сонцу, ды і неба для паэта «трывалая століь», створаная воляй боскай.

Нятрэба спісваць з рахунку і той відавочны факт, што ў XXI ст. для знакамітага гумарыста і перасмешніка Рыгора Барадуліна стала канцэптуальна-праграмнай творчасць рэлігійна-духоўнага кірунку. Ён стварыў блізкі па змесце да псалмоў цыкл «Палыновыя санеты». З яго нават па знешніх прыкметах ужо выразна бачна як аўтар «будуе» свой цыкл паводле біблейскіх канонаў: колькасць санетаў, а іх 33, сімвалізуе ўзрост Ісуса Хрыста.

Хрысціянскія матывы і вобразы цалкам запоўнілі твор, які можна ўспрымаць як жыццяпіс не толькі аўтара, але і кожнага чалавека. Таму і канцэптасфера неба ў яго творчасці значна мяняе акцэнты. Бо ў цэнтр светаўяўлення паэт ставіць не чалавека, а Усявышняга, да якога працінае ўсё сваё маленне, каб людзі на Зямлі не забываліся на сумленнасць, міласэрнасць, каханне, дабрыню, шчырасць, дараванне, спагаду і шкадаванне.

Хрысціянскімі матывамі прасякнуты паэтычны зборнік «Босая зорка», выдадзены ў 2001 г. Хаця ў аднайменным вершы, датаваным 1999 г., творца з басаногай зоркай параўноўвае сваю каханую жанчыну.

Канцэптасфера неба дапамагае аўтару ствараць і творы прытчападобнага характару. Свет іх лірычна-драматызаваны, бо тут выяўляюцца пачуцці самоты, пакаяння, тугі, болю і горычы страт.

У творчасці Максіма Танка выяўляюцца першапрычыны і паслядоўнасці ў стрыжнёвых сімвалах, як «Зямля і людзі», «Зямля і чалавек-працаўнік», «Зямля, як зямная аснова, і Сусвет». Бо для такога народа, як беларусы, зямля была, па вобразным выслоўі Я. Коласа, «асновай усёй Айчыне». Само паняцце «ўлада зямлі» ў селяніна-працаўніка раскрываецца своеасабліва, яно падкрэслівае непарыўныя сувязі ўзаемаадносін з прыродай, і атрымліваецца, што лексема «зямля» з’яўляецца сінонімам слова «прырода». Максім Танк нават надае аднаму са сваіх зборнікаў назву «Перапіска з зямлёй».

Але цвёрда стоячы на зямлі, паэт па-філасофску ўзіраецца ў неба. Распаўсюджаным канцэптам з’яўляецца сонца. Салярная лексіка Танка заслугоўвае больш значнай увагі. Паэт афарыстычна дэкларуе, што самая сапраўднае пачуццё любові захоўваецца ў сонечнай усмешцы дзіцяці. Не выпадкова і зборнік вершаў «За маім сталом» адкрываецца одай сонцу. І гэта сімвалічна: адразу зроблена ўдалая запеўка і паклон таму, без чаго немагчыма існаванне ўсяго жывога.

Звернем увагу і яшчэ на адну акалічнасць: у дадзеным зборніку цэнтральнае месца займае гімнічны спеў роднай прыродзе і ўслаўленне вернасці і шчырага кахання, агульначалавечай, спрадвечнай сутнасці жыцця, звычайнаму, бытавому пачатку.

Паэт ідзе не ад агульнага да канкрэтнага, а наадварот – ад канкрэтнага да агульнага: з дажджоў «бруяцца бруі рэк», пчолы збіраюцца на квітнеючы луг, а сонца ззяе, каб не размінуліся каханыя – таму і хочацца чалавеку пакланіцца сонцу. Засяродзім увагу яшчэ на двух, думаецца, кульмінацыйных момантах, якімі характарызуюцца вершы Максіма Танка, што ўтрымліваюць ў сабе салярную лексіку – гэта іншасказальнасць і прытчападобнасць, менавіта яны вядуць да ўзбуйнення ў лірычным творы думкі, узвышэння пачуцця сакральнасці, і перавазе ў ёй канкрэтнага над агульным.

Не на апошнім месцы ў творах паэта і канцэпт *зорка*. Возьмем да разгляду верш-прытчу «Кажуць, зоры ўсё знаюць...», у якім палемізм дасягае надзвычайнага напружання. М. Танк быццам разгадвае рэбус, закладзены ў аснове, здаецца, бясспрэчнага народнага выказвання, аспрэчвае аксіёматычнае – што зоры ўсё знаюць. Яго традыцыйны тэзіс не задавальняе. Ён ідзе глыбей і ў пошуку новай ісціны абапіраецца на навуковыя дасягненні: звесткі пра нас могуць даляцець толькі «праз мільёны гадоў светавых».

Аўтар пайшоў такім шляхам і сцвердзіў ісціну навейшую і даражэйшую, чым народнае выслоўе: «Добра, што ёсць бліжэйшыя зоры ў нас – пад якімі мы ўбачылі свет». Таму ён заклікае суцішыць сваю адвечную мітусню і прыслухацца,

«што нам зоры прадкажуць». А прасцей, паэт дэкларуе навучыцца жыць у суладдзі з прыродай.

Адычны характар мыслення Максіма Танка грунтуецца не толькі на доказе прамым, але і на доказе ад процілеглага. Гэта выклікана, думаецца, перш за ўсё своеасаблівасцю мыслення паэта, яго пошукам не той праўды, што ляжыць на паверхні, не той ісціны, што зразумела кожнаму, а ўсяго таго, што ляжыць глыбей, што не адразу кідаецца ў вочы. Многае тут можна растлумачыць і метафарычнасцю, алегарызмам як выразнымі адзнакамі Танкавага пісьма, пастаянным зваротам паэта да сімволікі, імкненнем у звычайным убачыць незвычайнае, будзённае ўзвесці ў ранг шматзначнага, велічнага, а часам, загадкавага.

**Заключэнне.** Такім чынам, у беларускай паэзіі вялікая ўвага надаецца канцэптасферы неба. Але кожны аўтар гэту задачу вырашае з дапамогай індывідуальных мастацкіх прыёмаў.

Змест канцэптаў *неба*, *зоркі*, *сонца*, *месяц*, рэпрэзентаваных у паэтычных тэкстах Максіма Багдановіча, Рыгора Барадуліна, Максіма Танка фарміруецца як на падмурку ўніверсальных агульнакультурных ведаў, так і на аснове індывідуальна-аўтарскіх уяўленняў аб прасторы неба. Уплыў агульнакультурных ведаў у творах дадзеных аўтараў адлюстроўваецца ў наяўнасці міфалагічных (Багдановіч, Барадулін, Танк) і хрысціянскіх (Багдановіч, Барадулін – у большай меры) матываў.

Ядром кожнага канцэпту з'яўляецца зрокава-пачуццёвы вобраз. Максім Танк, напрыклад, выкарыстоўвае метафарычныя і метанімічныя намінацыі неба: «блакітная вышыня», «бязмежны блакіт», «сіняя далеч», «зорнае мора». А моцна захапіўшыся салярнай сімволікай, часам параўноўваў сонца і са срэбным грошам, і карычнявата-жоўтым боханам свежавыпечанага хлеба, і з новымі залаціста-жоўтымі чаўнамі на любімай Нарачы.

Дарэчы, салярную сімволіку Танк аздабляе адпаведна каляронімамі «яркі», «прамяністы», «сонечны», «іскрысты», «жоўты», «залаты», «чырвоны» і інш.

Максім Багдановіч адмыслова фіксуе каляровыя характарыстыкі месяца (залаты, срэбны, жоўты, зялёны, снегавы і г. д.).

Рыгор Барадулін выкарыстоўвае канцэпты неба для ўгрунтавання аўтарскай развагі пра веру і бязвер'е, часавае і вечнае.

Намі адзначана, што па частотнасці ўжывання ў творах дадзеных аўтараў пераважае канцэпт *зорка.* Але ў Багдановіча яна ўспрымаецца як жывая (у тым ліку антрапаморфная) істота, якая надзелена воляй, здольнасцю адчуваць і выражаць эмоцыі. У Танка зоркі як знакі ночы супрацьпастаўляюцца сонцу.

А ў Барадуліна зоркі ўспрымаюцца як агонь, або прадметы, на якія ўздзейнічае святло і цеплыня агню боскай ласкі і чалавечай душы.

## Літаратура

1. Багдановіч М. Поўны збор твораў: у 3 т. Мінск: Навука і тэхніка, 1995. Т. 1. 752 с.

2. Максім Багдановіч: энцыклапедыя; склад. І. У. Саламевіч, М. В. Трус; навук. рэд. М. В. Трус; рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. 608 с.

## References

1. Bagdanovich M. *Pouny zbor tvorau: u 3 t.* [Complete Works: in 3 vol.]. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1995. Vol. 1. 752 p.

2. *Maksim Bagdanovich: Entsyklapedyya* [Maksim Bagdanovich: Encyclopedia]. Minsk, BelEn Publ., 2011. 608 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Федарцова Тамара Мікалаеўна** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: Fedortsova@belstu.by

## Information about the author

**Fedartsova Tamara Mikalaeuna** – PhD (Philology), Assistant Professor, the Departament of Belarusian Philology. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: Fedortsova@belstu.by

*Паступіў 28.03.2016*